■ Стратэгічны рэсурс

# ПРАФЕСІЯ ПРАГМАТЫЧНЫХ РАМАНТЫКАЎ

**3 красавіка ў Беларусі і іншых краінах СНД адзначаюць Дзень геолага — свята ўсіх тых, хто займаецца даследаваннем нетраў краіны і пошукам карысных выкапняў.
Напярэдадні свята «Звязда» пагаварыла з міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь
Андрэем КАЎХУТАМ пра перспектывы развіцця гэтай важнай для дзяржавы галіны.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Андрэй Марленавіч, што такое айчынная геалогія сёння?***

— У цяперашні час геалагічная галіна прадстаўлена шэрагам арганізацый, якія ўваходзяць у склад Мінпрыроды (дзяржаўнае прадпрыемства «НПЦ па геалогіі», дзяржаўнае прадпрыемства «Белдзяржгеацэнтр»), Мінбудархітэктуры (РУП «Геасэрвіс», Інстытут «НДІБМ»), канцэрна «Белнафтахім» (РУП «ВА «Беларуснафта», Інстытут «БелДНПІнафта»), Мінтранса (дзяржаўнае прадпрыемства «Белгіпрадор», РУП «Брэстаўтадор»), ААТ «Беларуськалій», ААТ «Белгорхімпрам».

За кожнай з назваў стаяць дзясяткі спецыялістаў, якія займаюцца вывучэннем і засваеннем нетраў нашай краіны. Толькі ў падпарадкаваных Мінпрыроды арганізацыях занята больш за 1500 чалавек.

***— Як вы ацэньваеце ролю і месца мінеральна-сыравіннай базы ў дынаміцы развіцця краіны?***

— Устойлівае развіццё эканомікі немагчыма без збалансаванага выкарыстання і ўзнаўлення мінеральна-сыравінных рэсурсаў, якія з'яўляюцца асновай матэрыяльнай вытворчасці і нацыянальнай бяспекі краіны.

Наша краіна валодае дастатковым мінеральна-сыравінным патэнцыялам, каб забяспечыць дастойнае развіццё эканомікі. Толькі за апошнія 20 гадоў у рэспубліцы адкрыта 17 радовішчаў нафты, падрыхтаваны да прамысловага засваення 3 участкі радовішчаў калійных соляў, 2 радовішчы каменнай солі, 2 — жалезных руд, 1 радовішча мелу і мергелю, 204 радовішчы пясчана-гравійнага матэрыялу, 570 радовішчаў пяску будаўнічага, 2 радовішчы фармовачных матэрыялаў, 6 радовішчаў цэментнай сыравіны.

Усяго з 1994 года прырост прамысловых запасаў нафты склаў больш за 5,8 млн тон, бурых вуглёў — 165,9 млн тон, гаручых сланцаў — 181,5 млн тон, гіпсу і ангідрыту — 125,6 млн тон, калійных соляў — больш за 5 млрд тон, каменнай солі — 608,1 млн тон, даламіту — 530,5 млн тон, будаўнічага каменю — 263,2 млн $м^3$, жалезных руд — 145,4 млн тон, прыродных будаўнічых матэрыялаў — 2,3 млрд $м^3$, кварцавых пяскоў — 258,2 млн т, прэсных падземных вод — 8,6 млн $м^3$/суткі, мінеральных вод — 11,6 тыс. $м^3$/суткі.

Разам з тым паспяховае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржавы залежыць не толькі ад забяспечанасці мінеральна-сыравіннымі рэсурсамі, але і ад таго, наколькі рацыянальна і комплексна яны выкарыстоўваюцца.

***— Якія мерапрыемствы плануюцца для інтэнсіфікацыі засваення карысных выкапняў?***

— Каб максімальна поўна і эфектыўна выкарыстоўваць ужо разведаныя мінеральна-сыравінныя рэсурсы, распрацаваны і цяпер праходзіць узгадненне план дзеянняў па інтэнсіфікацыі выкарыстання мінеральна-сыравіннай базы Беларусі на 2016-2020 гады.

**«За апошнія 20 гадоў у краіне адкрыта 17 радовішчаў нафты, падрыхтаваны да прамысловага засваення 3 участкі радовішчаў калійных соляў, 570 радовішчаў пяску будаўнічага, 6 радовішчаў цэментнай сыравіны».**

У пачатку месяца ён павінен быць унесены на разгляд Савета Міністраў. Дакумент прадугледжвае як павышэнне долі імпартазамяшчэння, так і павелічэнне экспартных паставак мінеральных рэсурсаў.

Калі казаць пра нафту, то існуючыя сёння аб'ёмы яе перапрацоўкі ў шмат разоў перавышаюць магчымасці здабычы ў нашай краіне. Штогод у Беларусі здабываецца 1,6 млн тон нафты, а перапрацоўваецца каля 25 млн тон. Як відаць, без імпартных паставак цалкам загрузіць беларускія перапрацоўчыя прадпрыемствы пакуль не ўяўляецца магчымым. Разведка і распрацоўка мясцовых запасаў нафты дазволіць паменшыць долю ўвозу вуглевадародаў.

Пры пэўных мерапрыемствах (узбагачэнні і давядзенні сыравіны да патрабаванай якасці) для імпартазамяшчэння можна выкарыстоўваць і беларускія запасы шкляных пяскоў. Вялікі патэнцыял мае і выкарыстанне ў нашай краіне — як для пітных, так і лячэбных мэт — радовішчаў мінеральных падземных вод.

Неабходна таксама вырашыць пытанне даступнасці мінеральнай сыравіны ў розных рэгіёнах краіны. Бо часам з-за няведання патэнцыялу мясцовых радовішчаў прадпрыемствам бывае больш выгадна атрымліваць сыравіну з-за мяжы, чым прывезці яе з іншых раёнаў Беларусі. Так, ААТ «Бярозабудматэрыялы» доўгі час завозіла сыравіну для вырабу керамічнай пліткі з Гомельскай вобласці. Але пасля даследавання радовішча, размешчанага непадалёк ад горада, гэта неабходнасць знікла.

***— Летась з'явілася інфармацыя, што рыхтуюцца змены і дапаўненні ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб нетрах. Чаму наспела неабходнасць карэкціроўкі гэтага дакумента?***

— Практыка ўжывання дзейнага Кодэкса аб нетрах сведчыць пра тое, што неабходна выключыць некаторыя калізіі і прабелы ў нормах, а таксама аптымізаваць функцыі органаў дзяржаўнага кіравання ў вобласці выкарыстання і аховы нетраў. Дакумент на разгляд парламентарыяў павінен паступіць у вясеннюю сесію ў пачатку красавіка.

***— Якія радовішчы маюць найбольшыя перспектывы з пункту гледжання перадачы іх у канцэсію?***

— У хуткім часе павінна завяршыцца падрыхтоўка прапаноў па перадачы сёлета ў канцэсію двух радовішчаў нафты ў Гомельскай вобласці (Пазнякевіцкая і Акуліцкая плошчы), Брынеўскага радовішча гіпсу, Добрушскага радовішча мелу і інш. Пасля ўзгаднення ў Мінэканомікі і Мінфіне прапановы будуць выстаўлены на тэндар, у якім змогуць прыняць удзел як беларускія, так і замежныя кампаніі.

***— У лютым прайшоў першы Еўразійскі горна-геалагічны форум. Як вы ацэньваеце яго вынікі і перспектывы?***

— Галоўнай мэтай форуму былі як геалагічныя даследаванні, так і іх сувязь з распрацоўкай радовішчаў карысных выкапняў. І адным з асноўных пунктаў рэзалюцыі, якая цяпер праходзіць узгадненне ў геалагічных службах краін — удзельніц форуму (Беларусі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана), стала стварэнне адзінай сістэмы пацвярджэння запасаў карысных выкапняў для Еўразійскага рэгіёна.

Неабходнасць пераходу на міжнародную сістэму пацвярджэння запасаў наспела ў многіх краінах, у тым ліку і ў Беларусі. Новая сістэма павінна быць зразумелай не толькі спецыялістам з краін СНД, але і замежным кампаніям, якія маглі і жадалі б укладваць сродкі ў асваенне радовішчаў у нашай краіне.

Для рэалізацыі гэтага праекта падпісаны дагавор паміж камісіямі па запасах карысных выкапняў Расіі і Беларусі па гарманізацыі працэдуры пацвярджэння запасаў, а таксама прыцягненню спецыялістаў абедзвюх краін для іх ацэнкі.

Аб'яднанне намаганняў у гэтай сферы — важная частка працы па прыцягненні замежных інвестыцый. Калі беларускія спецыялісты могуць падзяліцца напрацоўкамі ў дачыненні здабычы калійных соляў, то для нас цікавы вопыт калег з Еўразійскага рэгіёна па распрацоўцы радовішчаў гіпсу і жалезных руд.

***— Наколькі актыўна ў нашай краіне развіваецца экспарт геалагічных паслуг?***

— Беларускія геолагі карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам на міжнароднай арэне.

Напрыклад, навукоўцы-геолагі з НПЦ па геалогіі праводзяць геолагаразведачныя і геафізічныя работы на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, а таксама цесна супрацоўнічаюць з калегамі з Расіі і Польшчы.

Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» сёння мае прадстаўніцтва ў Венесуэле, дзе таксама створаны сумесныя прадпрыемствы па здабычы нафты («Петралера БелаВенесалана») і па сейсмаразведвальных работах («Сісміка БелаВенесалана»). Маштабныя праекты па сейсмічнай разведцы радовішчаў вуглевадародаў з 2013 года рэалізуюцца кампаніяй і ў Эквадоры. А расійскае даччынае прадпрыемства ТАА «Беларуснафта-Сібір» — яе найбуйнейшы канкурэнтаздольны сэрвісны праект за межамі краіны.

Адным са значных міжнародных праектаў для Беларусі з'яўляецца кантракт на будаўніцтва «пад ключ» горна-абагачальнага камбіната магутнасцю 1,4 мільёна тон у год хларыду калію на базе Гарлыкскага радовішча калійных соляў Туркменістана, заключанага паміж ААТ «Белгорхімпрам» і дзяржаўным канцэрнам «Туркменхімія».

***— Андрэй Марленавіч, як вы прыйшлі ў геалогію, чаму выбралі менавіта гэтую прафесію?***

— Гэта прафесія мне была цікавая і прывітая яшчэ з юнацкіх гадоў. Мой бацька таксама быў геолагам, працаваў у Акадэміі навук, выкладаў у Мінскім педагагічным універсітэце імя М. Горкага. Таму і я вырашыў пайсці па яго слядах і займацца гэтай мужнай і ў той жа час рамантычнай прафесіяй, адкрываць для сябе і для краіны новыя радовішчы, пашыраючы тым самым яе мінеральна-сыравінную базу.

*Ад душы віншую з юбілейным прафесійным святам рабочых, інжынерна-тэхнічных і навуковых работнікаў геалагічнай галіны. Зычу ім і іх сем'ям моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, адкрыццяў новых багаццяў недраў на карысць роднай Беларусі!*

**Вераніка КОЛАСАВА**

■ Прававая гасцёўня

# У водпуск за свой кошт?

## Дакажы, што ён патрэбен з уважлівай прычыны

***Мая сяброўка запрасіла мяне быць хроснай мамай яе дзіцяці. Я згадзілася. Жыве яна ў іншым горадзе, таму я хацела ўзяць водпуск за свой кошт на тры дні, каб паехаць да яе. Аднак наймальнік мне адмовіў. Сказаў, што на маім участку і так адзін работнік у водпуску, другі — на бальнічным, няма каму працаваць. Я магла б дамовіцца са сваімі калегамі, каб мяне падмянілі на гэты час. Ці меў права наймальнік адмовіць мне?***

**Святлана, медсястра, г. Мінск**



На пытанне адказвае **Яўгенія МІЦКЕВІЧ, кансультант упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы Галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі:**

— Ваш выпадак падпадае пад сітуацыю, калі кароткачасовы адпачынак без захавання заробку неабходны работніку па сямейна-бытавых абставінах. Уважлівасць прычын ацэньвае наймальнік, які і прымае рашэнне аб магчымасці прадастаўлення водпуску. Калі ў калектыўным дагаворы або пагадненні вашага прадпрыемства няма асаблівых удакладненняў і дамоўленасцяў, якія тычацца водпуску за свой кошт, то начальства можа вам адмовіць. І гэта не будзе парушэннем працоўнага заканадаўства.

Тым не менш, паколькі рашэнне аб магчымасці прадаставіць работніку такі водпуск з'яўляецца правам, а не абавязкам наймальніка, рэкамендую апісваць прычыну неабходнасці сацыяльнага водпуску ў сваёй заяве больш падрабязна. А каб начальства прыняло станоўчае рашэнне, лепш прыкласці дакументы, якія пацвярджаюць важнасць прычыны.

У Працоўным кодэксе пералічаны катэгорыі работнікаў, па жаданні якіх наймальнік абавязаны даць кароткачасовы водпуск без захавання заработнай платы працягласцю да 14 каляндарных дзён. Гэта жанчыны, якія маюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў або дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, Героі Беларусі, Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы; ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і ветэраны баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў; работнікі, якія даглядаюць хворых членаў сям'і ў адпаведнасці з медыцынскай даведкай аб стане здароўя; інваліды, якія працуюць на вытворчасці, у цэхах і на ўчастках, спецыяльна прызначаных для працы гэтых асоб.

Гэты пералік не з'яўляецца вычарпальным. Адпачынак за кошт работніка таксама можа быць прадастаўлены іншым працоўным у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, калектыўным дагаворам або пагадненнем. Такі водпуск даецца на працягу каляндарнага года ў перыяд, узгоднены абодвума бакамі.

Акрамя таго, Працоўным кодэксам прадугледжаны кароткачасовы водпуск без захавання заробку па сямейна-бытавых прычынах, для работы над дысертацыяй, напісання падручнікаў і па іншых уважлівых прычынах. Іх уважлівасць ацэньвае наймальнік, калі іншае не вызначана калектыўным дагаворам або пагадненнем. Адпачынак прадастаўляецца па дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам на працягу каляндарнага года працягласцю не больш за 30 каляндарных дзён, калі іншае не прадугледжана калектыўным дагаворам, пагадненнем або наймальнікам.

Выключыць канфліктныя сітуацыі з-за палітыкі «двайных стандартаў», калі пры аднолькавых абставінах аднаму работніку сацыяльны водпуск далі, а іншаму — адмовілі, досыць проста. Наймальніку дастаткова замацаваць уважлівыя, на яго думку, прычыны ў калектыўным дагаворы або пагадненні.

**Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы**

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ**
**ООО «Датч Стар»,**
***опубликованной в газете «Звязда 26.09.2013 г. № 181,***
**строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**
«...Стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир площадью **68,6 кв.м** на 14 этаже – *1500 (одна тысяча пятьсот) долларов США,* площадью **68,69 кв.м** на 5 этаже – *1100 (одна тысяча сто) долларов США,* площадью **65,39 кв.м** на 14 этаже – *950 (девятьсот пятьдесят) долларов США,* площадью **65,44 кв.м** на 10 этаже – *1250 (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США,* площадью **90,26 кв.м** на 18 этаже – *1000 (одна тысяча) долларов США».*
**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 153 33 24.**
УНП 191061436

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ООО «Лакорд» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**
- **СКЛАД общей площадью 618,4 кв.м, инв. № 620/С-3592, имеется кран-балка до 3 т.;**
- **ЗДАНИЕ ПРОИЗВОДСТВЕННО-СКЛАДСКОЕ общей площадью 1263,6 кв.м, инв. № 620/С-3594 (водопровод центральный, канализация центральная, отопление от собственной котельной на твердом топливе);**
- **АСФАЛЬТОБЕТОННОЕ ПОКРЫТИЕ, ЗАБОР, ТРАНСФОРМАТОР.**

Указанное имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 622282813101000042 площадью **1,0681 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, Дзержинский район, Негорельский с/с, п. Энергетиков, ул. Маяковского, 9.**
**Начальная цена без НДС – 9 000 000 000 бел. руб. Задаток 10%** от начальной цены **(900 000 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 (одного) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**
Аукцион состоится **02.05.2016** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.04.2016** до **16.00** по указанному адресу.
**Тел.: (8017) 207-61-34, (8029) 102-21-17.**